УДК 947.6«1944–1961»(476)

**А.А. Гаравая**

# Рэфармаванне вышэйшай філалагічнай адукацыі ў Беларусі ў сярэдзіне 50-х – пачатку 60-х гг. XX ст.

З сярэдзіны 1950-х гг. пачынаюцца грунтоўныя змены ў структуры падрыхтоўкі спецыялістаў-філолагаў. Рэфармаванне вышэйшай школы ішло ва ўмовах лібералізацыі грамадска-палітычнага жыцця краіны пасля «начнога дакладу» М.С. Хрушчова.

У абсалютнай большасці сярэдніх школ Беларусі да сярэдзіны 1950-х гг. настаўнікі, якія мелі толькі адну педагагічную спецыяльнасць (філолагі, гісторыкі, географы...), не маглі ў перспектыве атрымаць вучэбную нагрузку ў межах стаўкі. Таму яны былі вымушаны выкладаць у школе тыя вучэбныя дысцыпліны, якія ў ВНУ увогуле імі не вывучаліся ў межах спецыяльнасці. Такая сітуацыя стварала вялікія цяжкасці ў размеркаванні выпускнікоў педагагічных ВНУ і прыводзіла да непатрэбных перастановак педкадраў у сярэдніх агульнаадукацыйных установах.

Акрамя таго, у ВНУ прысутнічала вучэбная перанагрузка студэнтаў і было празмерным здрабненне дысцыплін і спецыяльнасцей. Таму Савет Міністраў СССР у маі 1955 г. зацвердзіў пастанову, па якой устанаўліваўся пералік спе-

цыяльнасцей, па якіх уводзілася двухпрофільная падрыхтоўка маладых спецыялістаў, у тым ліку і па філалагічным накірунку.

Міністэрства адукацыі СССР радыкальна змяніла ўсю наменклатуру педагагічных спецыяльнасцей для саюзных рэспублік, у тым ліку і БССР. Міністэрству асветы БССР на аснове Пастановы Савета Міністраў СССР (1956 г., жнівень) было прапанавана з 1956/1957 навучальнага года пачаць перабудову сваёй працы на аснове ўвядзення новых вучэбных планаў па педагагічных спецыяльнасцях так званага «шырокага профілю»: «руская мова, літаратура і гісторыя», «беларуская мова, літаратура і гісторыя»... [1].

Змены ў наменклатуры спецыяльнасцей афіцыйна былі абгрунтаваны, па-першае, неабходнасцю рацыянальнага выкарыстання настаўніцкіх кадраў; па-другое, хутчэйшым рашэннем праблемы забеспячэння малакамплектных вясковых школ кваліфікаванымі кадрамі настаўнікаў-прадметнікаў; па-трэцяе, неабходнасцю палітэхнізацыі ўсіх сфер вышэйшай адукацыі.

У 1956 г. педагагічныя інстытуты СССР былі пераведзены на пяцігадовы тэрмін навучання, што прывяло да рэарганізацыі факультэтаў педагагічных інстытутаў у рэспубліцы. Так, у Гродзенскім, Мінскім дзяржаўных педагагічных інстытутах былі адчынены новыя спецыяльнасці: «руская мова, літаратура, гісторыя»; «беларуская мова, літаратура, гісторыя». Аднак у Магілёўскім і Віцебскім педагагічных інстытутах філалагічныя аддзяленні шырокага профілю адчынены так і не былі. Архіўныя крыніцы не даюць тлумачэння прычыны адсутнасці тут філалагічных факультэтаў.

У студзені 1957 г. адбылося пасяджэнне калегіі Міністэрства асветы БССР. На павестцы дня стаяла пытанне: зацвярджэнне вучэбных планаў педагагічных інстытутаў у сувязі з пераходам на пяцігадовы тэрмін навучання. Былі адзначаны супярэчлівыя пазіцыі. Па-першае, аб'яднанне двух факультэтаў (гістарычнага і філалагічнага) – не вельмі ўдалая ідэя, бо студэнты атрымліваюць вялікую перанагрузку. Таму рацыянальна было б аб'яднаць гістарычны і геаграфічны факультэты, а філалагічны пакінуць асобным факультэтам. Па-другое, прынята пастанова Савета Міністраў БССР аб стварэнні гісторыка-філалагічнага факультэта, а значыць не павінна быць дыскусій, неабходна проста выканаць дадзенае даручэнне. Міністр асветы БССР І.М. Ільюшын адзначыў, што не супраць пакінуць аб'яднаным гісторыка-філалагічны факультэт, аднак пры такім падыходзе не ў поўнай ступені будуць выкарыстаны кваліфікаваныя спецыялісты. З другога боку, студэнты такога факультэта будуць менш падрыхтаваны, у параўнанні з выпускнікамі Гомельскага інстытута, дзе ёсць толькі філалагічны факультэт і, адпаведна, у яго вучэбным плане больш гадзін на спецыяльныя дысцыпліны [1, спр. 18, арк. 58–60]. У выніку былі прааналізаваны погляды супрацоўнікаў Міністэрства асветы і выкладчыкаў ВНУ, але кіруючыся пастановамі ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР прынялі рашэнне аб стварэнні гісторыка-філалагічнага факультэта.

Змяненне наменклатуры спецыяльнасцей адбілася на якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. У гэтым плане паказальна перапіска паміж Гродзенскім педінстытутам і Міністэрствам асветы БССР. У Гродзенскім інстытуце з двух факультэтаў – філалагічнага і гістарычнага – быў створаны адзін факультэт – гісторыка-філалагічны з двума аддзяленнямі. Загад Міністэрства асветы БССР прадугледжваў стварэнне вучэбных груп на аддзяленнях: «гісторыя, руская мова і літаратура» і «гісторыя, беларуская мова і літаратура». Колькасць груп па аддзяленнях была вызначана такім чынам, што ў абавязковым парадку акадэмічныя групы былога гістарычнага факультэта аўтаматычна пераводзіліся на адно з філалагічных аддзяленняў: рускае ці беларускае па ўсіх курсах, з першага па чацвёрты. Такім чынам, студэнты-гісторыкі павінны

былі атрымаць філалагічную адукацыю на IV курсе і дапоўніць яе на V курсе. У выніку склалася сітуацыя, калі на II, III, IV курсах гісторыка-філалагічнага факультэта неабходна было працаваць на кожным курсе па чатырох вучэбных планах. Акрамя таго, частка студэнтаў гістарычнага факультэта (на першым курсе – 15, на другім – 12, на трэцім – 15 чалавек) ніколі не вывучалі беларускую мову. Улічваючы ўсё гэта, кіраўніцтва Гродзенскага педагагічнага інстытута звярнулася з просьбай да Міністэрства асветы БССР аб адмене перавода студэнтаў гістфака на спецыяльнасці «гісторыя, руская мова і літаратура» і «гісторыя, беларуская мова і літаратура». У адказ было атрымана тлумачэнне, што кіраўніцтву інстытута неабходна дакладна кантраляваць ход вучэбнага працэсу, «...уважліва падысці да складання раскладу, бо новыя вучэбныя планы даюць магчымасць арганізаваць паточныя лекцыі для ўсяго курса па агульнаінстытуцкіх дысцыплінах; для ўсяго былога філалагічнага факультэта – па дысцыплінах гістарычнага цыклу, для ўсяго былога гістарычнага факультэта – па агульных мовазнаўчых і літаратуразнаўчых курсах», а ў далейшым – «строга кіравацца загадам Міністэрства асветы БССР № 235 ад 18 кастрычніка 1956 г.» [2]. Неабходна адзначыць, што ў час рэфармавання арганізацыйнай структуры педагагічных ВНУ ні ў выкладчыкаў, ні, тым больш, у студэнтаў не пыталіся, дзе яны жадаюць вучыцца і працаваць, якую спецыяльнасць атрымаць. Працэй – чалавечы і прафесійны фактары практычна ігнараваліся.

З увядзеннем факультэтаў «шырокага профілю» па структуры і зместу змяніліся вучэбныя планы. Узрасла аўдыторная нагрузка на студэнтаў. Аднак грамадска-палітычны (504 гадзіны) і псіхолага-педагагічны (706 гадзін) цыклы фактычна засталіся без змен. У той час як вызначальнай асаблівасцю гісторыка-філалагічных дысцыплін спецыяльнасцей «беларуская мова і літаратура, гісторыя», «руская мова і літаратура, гісторыя» ў вучэбных планах ВНУ было змяншэнне колькасці гадзін у параўнанні з папярэднімі вучэбнымі планамі для аднапрофільных факультэтаў (на 10–25%). Так, па вучэбным планам спецыяльнасцей: «беларуская мова, літаратура, гісторыя» агульная колькасць складала 4824 гадзіны: з іх на прадметы філалагічнага цыклу адводзілася 1957 гадзін, а на прадметы гістарычнага цыклу – 1262 гадзіны; «руская мова, літаратура, гісторыя» агульная колькасць гадзін складала 4434 гадзіны, з іх 1800 гадзін – на філалагічныя дысцыпліны і 1202 гадзіны – прадметы гістарычнага цыклу; «руская мова і літаратура, замежная мова» аб'ём вучэбнай нагрузкі – 4574 гадзіны, з іх 3510 (77%) па спецыяльнасці (1628 – руская філалогія і 1942 – замежная мова); «беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура» агульная колькасць гадзін складала 4058, з іх 1286 – на беларускую філалогію і 1028 – на рускую філалогію. У цэлым, у вучэбных планах факультэтаў «шырокага профілю» педагагічных ВНУ па колькасным паказчыку дысцыпліны філалагічнага цыклу складалі прыкладна 65%, у параўнанні з гістарычнымі дысцыплінамі. У адпаведнасці з рэформай, у вышэйшай школе былі перагледжаны філалагічныя праграмы – на сучасную беларускую мову адводзілася 440 гадзін, параўнальную граматыку рускай і беларускай мовы – 90 гадзін, дыялекталогію беларускай мовы – 80 гадзін, гістарычную граматыку беларускай мовы – 152 гадзіны (для філалагічных факультэтаў). А для гісторыка-філалагічных факультэтаў на вывучэнне сучаснай беларускай мовы – 310 гадзін (што на 30% менш), гісторыі беларускай мовы – 118 гадзін. Скарачэнне колькасці гадзін на вывучэнне мовы было выклікана ўвядзеннем блоку дысцыплін гістарычнага зместу [1, спр. 376, арк. 7–7 аб., 38–38 аб.].

У канцы 1950-х гг. стала відавочным паступовае звужэнне сферы выкарыстання беларускай мовы ў педагагічных інстытутах і БДУ. Курс на камуністычнае «будаўніцтва» зусім не спрыяў развіццю нацыянальных

асаблівасцей, у тым ліку і мовы. Афіцыйныя адносіны да развіцця беларускай мовы прадэманстраваў М.С. Хрушчоў у час прыезду ў Мінск на святкаванне 40-й гадавіны БССР. На прыступках БДУ ён выказаўся выразна: «Чем быстрее все мы будем разговаривать по-русски, тем быстрее построим коммунизм...» [1, ф. 5 п, воп. 81, спр. 1428, арк. 78–79].

Найвышэйшым уздымам у рэфармаванні ўсёй сістэмы народнай адукацыі ў Беларусі, уключаючы і вышэйшую школу, стала прыняцце Вярхоўным Саветам СССР у снежні 1958 г. Закона «Об укреплении связи школы с жизнью и о дальнейшем развитии системы народного образования в СССР». Прыняцце гэтага закону ў сферы адукацыі стала рэальным адлюстраваннем ходу тых новых складаных унутрыпалітычных і сацыяльна-эканамічных працэсаў у жыцці савецкага грамадства, пачатак якому паклаў у 1956 г. XX з'езд КПСС. Адначасова падкрэслівалася і неабходнасць канкрэтных дзеянняў па рашэнні складаных праблем, з якімі сутыкнулася грамадства ў сярэдзіне 1950-х гг., у тым ліку і ў сферы адукацыі [3]. У законе адзначалася, што вышэйшая школа не паспявала за дасягненнямі ў навуцы і тэхніцы, яна аддалялася ад патрабаванняў жыцця, перадача ведаў часцей за ўсё ішла праз «гатовыя» палажэнні без актыўнага ўдзелу аўдыторыі.

Гэты закон стаў новай афіцыйнай партыйна-дзяржаўнай дактрынай у галіне адукацыі. Галоўнымі задачамі ВНУ СССР, адпаведна і БССР, былі аб'яўлены: «падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў, выхаваных на аснове марксісцка-ленінскага вучэння, авалодаўшых навейшымі дасягненнямі айчыннай і замежнай тэхнікі, якія добра ведаюць практыку справы камуністычнага будаўніцтва». Уся сістэма вышэйшай школы павінна была прыняць актыўны ўдзел у разгорнутым будаўніцтве камунізму ў СССР, уводзіліся зусім іншыя прынцыпы камплектавання ВНУ, абвешчаныя ўжо на нечарговым XXI з'ездзе КПСС, зноў новы віток набыло рэфармаванне іх арганізацыйнай структуры, форм і метадаў навучання і выхавання студэнцтва [3, с. 271–272].

У форму і змест падрыхтоўкі спецыялістаў філалагічных спецыяльнасцей, на аснове закону аб сувязі школы з жыццём, у хуткім часе былі ўнесены значныя змены. Абітурыенты, якія здолелі паступіць адразу пасля заканчэння сярэдняй школы на філалагічны факультэт БДУ, аўтаматычна былі пераведзены на завочную форму, дзе праходзілі навучанне ўвесь першы курс. Своеасаблівае «паляпшэнне» арганізацыі вучэбнага працэсу будучых спецыялістаў-філолагаў вядучага гуманітарнага ВНУ было вызначана адпаведнымі дырэктывамі і нарматыўнымі дакументамі агульнасаюзнага і, у прыватнасці, рэспубліканскага ўзроўняў – Пастановай Савета Міністраў СССР «О формах и сроках обучения в вузах и о производственной работе и практике студентов» (1959 г., красавік) і выдадзенай у 1960 г. Міністэрствам вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР пастановай аб вытворчай рабоце і вытворчай практыцы студэнтаў ВНУ рэспублікі. З прычыны прыёму на дзённае аддзяленне ўсіх вышэйшых школ, у тым ліку ва універсітэт і педагагічныя інстытуты, толькі асоб, у якіх меўся стаж работы не менш за два гады ці якія закончылі службу ў арміі, адпаведна астатнія студэнты першага курса, якія паступілі без стажу работы, павінны былі прайсці так званую «вытворчую практыку» ці адпрацаваць не менш аднаго года на прадпрыемстве, ва ўстанове ці арганізацыі [1, ф. 1220, воп. 1, спр. 1, арк. 33]. З пункту гледжання эфектыўнасці навучання, якасці набыцця прафесійных навыкаў будучымі спецыялістамі-філолагамі такі падыход не садзейнічаў павышэнню ўзроўню якасці іх падрыхтоўкі. Напрыклад, БДУ не меў на той час адпаведнай сваёй вучэбна-вытворчай базы, якая б магла дазволіць арганізаваць набыццё аднагадовага працоўнага стажу студэнтамі-першакурснікамі гуманітарных факультэтаў з улікам профілю іх будучай спецыяльнасці, што з'яўлялася не-

абходнай умовай для далейшага навучання на II–V курсах дзённага аддзялення. Студэнты-першакурснікі, не перарываючы вучобу, павінны былі прайсці чатыры месяцы навучання будучай прафесіі, атрымаць адпаведную кваліфікацыю, катэгорыю, што фіксавалася адзнакай у заліковай кніжцы. Па заканчэнні перыяду працы студэнт прадстаўляў у ВНУ станоўчую характарыстыку ад адміністрацыі ўстановы, без наяўнасці якой нават не ставілася пытанне аб пераводзе на другі курс навучання.

На першым курсе дзённага філалагічнага аддзялення педагагічных інстытутаў пастанова аб пераводзе на завочную форму навучання не дзейнічала, бо там падрыхтоўка вялася па падвоенай педагагічнай спецыяльнасці. Дастаткова было ў рамках рэалізацыі патрабаванняў закона аб умацаванні сувязі школы з жыццём арганізаваць праходжанне вучэбнай «непарыўнай» педагагічнай практыкі студэнтамі малодшых курсаў паралельна з вучэбнымі заняткамі. Для студэнтаў старэйшых курсаў прадугледжвалася абавязковае праходжанне вытворчай практыкі ў якасці выкладчыкаў-прадметнікаў тэрмінам не менш за шэсць месяцаў. Акрамя таго, за ўсімі педагагічнымі інстытутамі замацоўваліся базавыя гарадскія і вясковыя школы, на базе якіх павінны былі ажыццяўляцца ўсе практыкі і набыццё студэнтамі педагагічных ВНУ прафесійных навыкаў у па-за навучальны час [1, ф. 1220, воп. 1, спр. 1, арк. 32–33].

Аднак у 1958/1959 навучальным годзе па распараджэнні ЦК КП(б)Б быў прыпынены набор абітурыентаў на філалагічны факультэт Гомельскага педагагічнага інстытута імя В.П. Чкалава: у сувязі з перанасычэннем спецыялістаў дадзенага профілю. Адміністрацыя інстытута знайшла смеласць паставіць пытанне перад ЦК КП(б)Б аб неабходнасці захавання філалагічнага факультэта. Адзначалася грунтоўная праца прафесарска-выкладчыцкага саставу. Так, з 31 выкладчыкаў-філолагаў ВНУ – 17 (55%) кандыдатаў навук і дацэнтаў, 1(3%) доктар філалагічных навук (за пасляваенны перыяд былі абаронены 1 доктарская і 10 кандыдацкіх дысертацый і інш.) [1, ф. 4 п, воп. 17, спр. 186, арк. 79–81]. Разам з тым з мэтай узбуйнення ВНУ у 1959 г. быў зачынены Полацкі педагагічны інстытут. Яго фізіка-матэматычны факультэт перавялі ў Віцебскі педінстытут, а філалагічны – перадалі Магілёўскаму і Брэсцкаму педінстытутам (з той нагоды, што філалагічнага факультэта не было ў Віцебскім педінстытуце) [1, спр. 43, арк. 37]. Гэтыя факты сведчылі аб адсутнасці ў рэспубліцы дакладнага кантролю і ўліку за колькасным і якасным працэсам падрыхтоўкі спецыялістаў-філолагаў з вышэйшай адукацыяй. І, як вынік, савецкае кіраўніцтва прымала найбольш лёгкі варыянт вырашэння падобнай сітуацыі. Замест таго, каб прааналізаваць прычыны цяжкасцей у сістэме адукацыі і прадухіліць далейшае іх з'яўленне, адбываўся працэс «пазбягання» канкрэтнай праблемы шляхам ліквідацыі «лішніх» структурных адзінак.

У сувязі са зменамі ў сферы вышэйшай адукацыі і ў мэтах развіцця і ўдасканалення сістэмы вышэйшай сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі ў рэспубліцы ў жніўні 1959 г. выйшаў загад Міністэрства асветы БССР па рашэнні ўрада аб ліквідацыі з 1 верасня 1959 г. аддзела педагагічных ВНУ і перадачы яго Міністэрству вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР. БДУ таксама ў 1959 г. перайшоў у падпарадкаванне дадзенага Міністэрства (да жніўня 1959 г. быў у падпарадкаванні Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР).

На пачатку 1960-х гг. сталі відавочнымі першыя вынікі ўвядзення факультэтаў «шырокага профілю». Гісторыка-філалагічны факультэт Гродзенскага інстытута склаў справаздачу за 1960/1961 навучальны год, дзе была прадстаўлена разгорнутая і вельмі супярэчлівая характарыстыка дзейнасці такога факультэта. З аднаго боку, веды выпускнікамі спецыяльных прадметаў,

іх агульнаадукацыйная і ідэйна-палітычная падрыхтоўка штогод павышаліся. Гісторыя і літаратура як бы ўзаемна дапаўнялі адна адну, бо немагчыма зразумець літаратуру па-за часу і прасторы, па-за дакладных гістарычных працэсаў – па-за гісторыі. З другога боку, літаратурнымі сродкамі, мастацкімі вобразамі ствараецца большая выразнасць і значнасць гістарычных працэсаў. Аднак гэтыя агульныя міждысцыплінарныя ўзаемасувязі пры арганізацыі навучальнага працэсу ставілі ў ВНУ шмат нявырашаных пытанняў. Хутка навучальны працэс паказаў, што праграмы гісторыка-філалагічных факультэтаў нездавальняючыя, бо яны былі складзены для факультэтаў «вузкай» спецыялізацыі. У выніку на факультэтах «шырокага профілю» вучэбны план перанагружаўся не зусім неабходным матэрыялам, некаторыя пытанні сумежных дысцыплін дубліраваліся і г.д. [2, спр. 495, арк. 30–36].

Арганізацыйна-структурнае рэфармаванне вышэйшай філалагічнай адукацыі сярэдзіны 1950-х – пачатку 1960-х гг. унесла вельмі супярэчлівыя карэктывы ў падрыхтоўку спецыялістаў-філолагаў. З аднаго боку, міжпрадметныя сувязі і вытворчая практыка спрыялі больш глыбокаму асэнсаванню і засваенню спецыяльных прадметаў, фарміраванню прафесійных навыкаў. З другога боку, рэформы праводзіліся без папярэдняй падрыхтоўкі, што выклікала цяжкасці ў арганізацыі працэсу навучання ў ВНУ. Узрасла вучэбная нагрузка на студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкі састаў, асобныя тэмы і пытанні дысцыплін дубліраваліся і інш. Відавочна, што «шырокі профіль» у ВНУ сябе не апраўдаў. І ў 1963 г. выйшла пастанова калегіі Міністэрства вышэйшай сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР аб пераводзе педагагічных інстытутаў з 5-гадовага на 4-гадовы тэрмін навучання з раздзяленнем спецыяльнасцей. І ўжо ў гэтым жа годзе прыкладна 40% ВНУ БССР былі пераведзены на 4-гадовы тэрмін навучання. Аднак такія навааўвядзенні як непарыўная педагагічная і вытворчая практыкі, у рамках закону аб умацаванні сувязі школы з жыццём, заставаліся прыярытэтнымі для ВНУ.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.*** – Фонд 42. – Воп. 5. – Спр. 354. – Арк. 20.
2. ***Научно-методическое учреждение «Государственный архив Гродненской области».*** – Фонд 991. – Воп. 1. – Спр. 372. – Арк. 2.
3. ***Коммунистическая партия Советского Союза. В резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986):*** в 15 т. / Институт марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – М.: Политиздат, 1983–1989. – Т. 9: 1956–1960 гг. / С.В. Решетова [и др.]. – 1986. – С. 437.



*S U M M A R Y*

*From the middle of the 1950s till the beginning of the 1960s the first main reformations in higher philological education in the BSSR took place. The organizational and structural changes (introducing the faculties of «wide profile», realization of the law «about fortifying the connection between school and life and about further development of the system of national education in the USSR») were caused by social, political and cultural changes in the society.*



*Поступила в редакцию 28.02.2008*